Лідзія Арабей



...ніколі не змагла б я жыць у эміграцыі;
хоць часам і балюча раніць мяне радзіма,
але толькі тут маё месца...

# Пошукі ісьціны

***Абразкі***

## ***ПАРАДОКСЫ***

Правадыр пралетарыяту Уладзімір Ільіч Ленін гаварыў, што калі пабудуецца камунізм, адносіны людзей да грошай будуць такія пагардлівыя, што з золата пачнуць будаваць прыбіральні.

Аднак дасюль працэнтаў пяцьдзясят расейцаў, ды і беларусаў, ня маюць ня толькі залатых унітазаў, але і звычайных, па-ранейшаму бегаюць са сваёю патрэбаю ў «шпакоўні».

А вось у Брунеі, у новым гатэлі «Ампайр», уся сантэхніка сапраўды зробленая з чыстага золата. То, можа, там цяпер камунізм? Хаця кіруе Брунеем султан — самы багаты чалавек на зямлі.

## ***НАРОДНЫ***

Мы ўсе ня ведаем, што чакае нас за павароткаю. Мяне за павароткаю аднойчы чакала бальніца — рэ-

анімацыя ў інстытуце кардэалогіі. Доўгае памяшканьне, перагароджанае на адсекі шырокімі жалюзямі. Уяўленьне, што ты ў асобнай палаце, побач з табою другія хворыя, але ты іх ня бачыш, толькі чуеш кожны іх уздых.

Побач са мною, зьлева, ляжаў вельмі хворы дзядок, ён усё стагнаў, але калі яго адпускала, любіў пагаварыць. За гэтым дзядком ляжаў другі дзядок, але ціхі. Той што стагнаў, ня меў уяўленьня, чым я займаюся, і не падазраваў, што я маю нейкія адносіны да літаратуры. Але аднойчы, калі яго адпусьціла, ён сказаў: — Люблю я Пушкіна і Кандрата Крапіву. І пачаў дэкламаваць:

Ехаў дзедка на кірмаш
З ім на возе баба,
Конік з выгляду дарма,
ды цагнуў ён слаба...

І раптам другі дзядок, ціхі, што ляжаў за маім суседам, падхапіў:

Меў ня болей двух гадоў,
Як суседзі кажуць,
Баба ж тая — сем пудоў
Сама меней важыць...

Тут ужо і я ня вытрывала, пачала чытаць байку далей, а за мною раптам жанчына, што ляжала ў мяне справа, далучылася да нашай дэкламацыі.

Нас у рэанімацыі ляжала чацьвёра, і ўсе чацьвёра ведалі гэту байку і, ведалі хворыя, дачыталі яе да канца.

І тады я падумала — вось сапраўды народны пісьменьнік — Кандрат Крапіва. Яго ведае народ. І яшчэ я падумала: і мову нашу ведаюць, яна жыве, але мы саромеемся яе, як дурной хваробы.

## *ЭКЗОТЫКА*

«Ноччу быў моцны вецер і раніцою ўся трава ў садзе была ўсыпаная апельсінамі» ... Гэта з кнігі англійскага пісьменьніка Рычарда Олдзінгтона — «Усе людзі — ворагі». Пісьменьнік расказваў пра сваё падарожжа па Італіі.

І я ўявіла сабе, як валяюцца ў траве гэтыя аранжавыя мячыкі, такі экзатычны і дарагі прадукт для нашага геаграфічнага поясу.

Потым падумала: а ў нас пасьля моцнага ветру хіба не валяюцца ў траве, у садзе, крамяныя яблыкі? А яны ж таксама для якіх-небудзь алеутаў экзатычны фрукт...

І ўсё такі — трава была ўсыпаная апельсінамі...

## *РАДАСЬЦЬ*

Бабка ўжо некалькі гадоў жыла ў сваёй трохпакаёвай кватэры адна і пусьціла да сябе ўнучку з мужам. Унучка спадзявалася, што бабка хутка адыйдзе ў іншы сьвет, але бабка жыла і жыла. Унучцы гэта надакучыла і яна пачала патрабаваць, каб бацька аддаў сваю маці ў прытулак для старых.

Бацька ўпіраўся, і вось, нарэшце, бабка памерла. Уяўляю, як радавалася ўнучка бабчынай сьмерці.

### *ПЕРАБЕЖЧЫКІ*

Хочацца спытаць у тых, што перабеглі з нашага саюза да Чаргінца:
— А вы не баіцёся, што некалі вам скажуць: «Все вы хрюкали возле моего корыта»...
Альбо:
— Я вас нашел на помойке...

### *ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ*

На чыжоўскіх могілках, на галоўнай алеі, ў два рады магілы салдат, што загінулі ў Аўганістане. І гэтых нябожчыкаў, і тых, што засталіся жывыя, пакалечаныя, называюць воінамі-інтэрнацыяналістамі. Цікава, якія інтэрнацыянальныя каштоўнасьці яны абаранялі? Якія інтарэсы Савецкага Саюзу абаранялі ў Аўганістане? Савецкія воіны забівалі аўганцаў, аўганцы забівалі савецкіх воінаў. І дасюль удзельнікаў гэтай бязглуздай вайны называюць воінамі-інтэрнацыяналістамі?..

### *БЕЗДАНЬ*

У 1937 годзе яўрэйскага паэта Ізі Харыка арыштавалі як ворага народу. Засталася жонка і двое дзетак-хлопчыкаў. Хутка арыштавалі і жонку Ізі Харыка, як жонку ворага народу. Дзяцей аддалі ў прытулак.

Ізі Харыка расстралялі. Жонцы далі дзесяць гадоў. Адбыўшы свой лагерны тэрмін, жонка Ізі Харыка вярнулася ў Менск і пачала шукаць дзяцей. Не знайшла. Яны згінулі, як у бездані.

А можа, і пражылі жыцьцё, ня ведаючы, хто яны, хто іхнія бацькі, якога яны роду.

### *ПОМСТА*

Да жыцьця і да літаратуры трэба адносіцца вельмі сур'ёзна. Памылкі, якія мы робім у жыцьці, легкадумныя адносіны да творчасьці потым вельмі жорстка помсьцяць.

### *МАЛАДОЕ*

На дубе з восені засталося лісьце. Яно перажыло моцныя маразы, завеі і нават цяпер, напрадвесьні трымалася — счарнелае, скручанае.

Але вось на яго месцы пачалі нараджацца маладыя лісткі і бязьлітасна паскідалі старыя.

Ці ня так бязьлітасна глядзіць на старых маладое пакаленьне. Быццам хваляцца сваёю сілаю, энергіяй і кажуць старым людзям — вы ўжо сваё аджылі, саступіце месца нам.

І ня думаюць, што некалі і іх, як тыя старыя лісточкі, новая моладзь паскідае.

### *ЗАМУРАВАЛІ*

Хаджу па могілках, гляджу на помнікі, а пад помнікамі, на магілах — цяжкія пліты — мармуровыя, гранітныя.

Як жа моцна замуравалі блізкія сваіх нябожчыкаў, каб каторы і захацеў устаць, вярнуцца ў гэты сьвет, то ня здолее. І да іх не даклічашся.

## *ТАКОЕ Ж*

Рабілі аперацыю негру, чорнаму, як смоль. І сястрычка-асістэнтка дзівілася, што ўнутры ў негра ўсё такое ж, як і ў белага чалавека. Такое ж ружовае, і ўсё на сваім месцы.

## *НЕБЯСьПЕКА*

Чалавек са сваім розумам такі ж небясьпечны, як малпа з гранатаю. Бо там, у мазгах чалавечых, зараджаюцца войны, зараджаецца тэрарызм, разбой і іншыя пачварныя зьявы. Як ня ведаеш, чаго чакаць ад малпы з гранатаю, так ня ведаеш, што яшчэ можа прыдумаць розум чалавечы на злом галавы чалавечай.

## *КРЭСЛА*

Лукашэнка на пасяджэньні міністраў расьпякаў сваіх падначаленых, мусібыць, так, як расьпякаў некалі ў саўгасе сваіх брыгадзіраў.

— Калі што ня так — выляціш з крэсла! — крычаў ён.

І міністры сядзелі, як хлапчукі, апусьціўшы галовы, баючыся паварушыцца, каб сапраўды ня вылецець з крэсла.

## *ВЕТЛІВЫ*

у Пецярбурзе ў падваротні маю стрыечную сястру Ірыну схапіў бандыт, прыціснуў да сьцяны і кажа:

— Давай пяцьсот рублёў, а то размажу па гэтай сьцяне!

Сястра — пенсіянерка, хворая жанчына, вельмі спалохалася і гаворыць:

— Пяцьсот рублёў у мяне з сабою няма, але аддам вам усё, што ёсьць у мяне ў кашальку...

— Давай! — адказаў бандыт. Узяў кашалёк, выграб усё, што там было і сказаў:

— Дзякуй!

Во якія ветлівыя бандыты ў Пецярбурзе!

## *СТАЛІН*

Загубіўшы мільёны людзей, Сталін, між тым, сам баяўся сьмерці і бярог сваё жыцьцё. Ён ніколі ня лётаў самалётам — не давяраў гэтым жалезным птушкам. Усюды езьдзіў цягніком, густа абстаўляючы калейку вернымі стражамі.

## *ДЗЯРЖАВА*

Дзяржаве не патрэбны вельмі разумныя людзі, яна іх баіцца і тым альбо іншым спосабам зьнішчае.

Дзяржаве не патрэбны адукаваны, дасьведчаны народ, яна яго баіцца і рознымі спосабамі адурманьвае. Адурманеным народам зручней кіраваць.

## *ПЕРАМОГА*

Амерыканскі пісьменьнік Дэн Браўн напісаў дэтэктыў на рэлігійную тэму «Код да Вінчы». Як і ва ўсякім дэтэктыве, тут шмат выдумкі, а

яшчэ таго, чаго ніхто ня ведае і ня можа аспрэчыць з дакументам у руцэ. Кніга зрабілася бестселерам у Амерыцы, а Галівуд зрабіў на яе аснове кінафільм. Увесь сьвет прыняў гэты фільм абыякава, акрамя Беларусі і яшчэ нейкіх двух, самых адсталых афрыканскіх краінаў. Беларускі клір, і каталіцкі, і праваслаўны (паразумеліся, нарэшце) ўбачылі ў фільме абразу Хрысту. І павялі кампанію — забараніць гэта кіно. І што вы думаеце — забаранілі, фільм зьнялі з экранаў, царква перамагла сьвецкую ўладу.

Мне здаецца, што мы дакаціліся ўжо да сярэднявечча, яшчэ крышку, і апынімся ў першабытным ладзе.

## *РАЗГРОМ*

З будынку энцыклапедыі, які з такім стараньнем будаваў Пятрусь Броўка і якая носіць яго імя, выкідваюць выдавецтва энцыклапецыі.

З Дому літаратараў выкінулі Саюз пісьменьнікаў і бібліятэку пісьменьнікаў, дзе тысячы кніг з аўтографамі беларускіх класікаў. На месцы бібліятэкі зьбіраюцца адчыніць рэстаран.

Свае, мясцовыя Мамаі ходзяць па краіне і нішчаць беларускую культуру, усё беларускае.

## *ХЛЕБ*

У час вайны, у першыя пасьляваенныя гады у нашага пакаленьня не было нічога больш сьвятога, больш жаданага, чым кавалак хлеба. Я, студэнтка універсітэту, сядзела ў пакоі, вучыла нейкі прадмет і не магла засяродзіцца — у тумбачцы ляжаў кавалак хлеба і ён вабіў, цягнуў да сябе. Уставала і зьядала той хлеб. Ну вось, няма яго, ну і няма, можна вучыць далей.

Сёньня сытыя, перакормленыя цёткі і дзядзькі адварочваюцца ад хлеба.

— У мяне дыета, я хлеба ня ем...

Нечым лепшым, смачнейшым напхалі шлунак. Аб’еліся.

Добра гэта ці дрэнна?

## *РЭАБІЛІТАЦЫЯ*

Пасьля дзяцінства ён, пажылы мужчына, плакаў упершыню. Калі атрымаў дакумент аб рэабілітацыі.

Там, у тайзе, на лесапавале, калі рукі і ногі заходзіліся ад холаду, калі вецер марозіў твар і гатовы быў кожную хвіліну паваліць разам з сасною галоднае слабае цела, ён ня плакаў, а толькі сьціскаў зубы.

Ён ня плакаў у брудным халодным бараку, дзе іх, нябог, зьбівалася чалавек пяцьдзясят, і кожны са сваёй міскі сёрбаў баланду з гнілых буракоў і сьмярдзючай рыбы. Ён толькі пытаў невядома ў каго — завошта?

Ён ня ведаў за сабою абсалютна ніякай віны перад дзяржаваю. Дык завошта яна з ім так? Адарвала ад жонкі, ад дзяцей, кінула ў гэтую бездань.

І цяпер ён трымаў у руках паперку, якая сьведчыла, што нізавошта,

нізавошта трымалі яго ў пекле дваццаць гадоў. І цяпер дазваляюць — ідзі на ўсе чатыры бакі, ідзі, куды хочаш, ты ні ў чым не вінаваты.

Ён трымаў гэту паперку і плакаў.

***чорная эпоха***

Чорнымі літарамі будзе ўпісаная ў гісторыю Беларусі нашая эпоха. Нішчыцца ўсё нацыянальнае, беларускае, нішчыцца Саюз пісьменьнікаў замест яго створаны марыянетачны, падначалены ўладам.

Цьвет беларускай літаратуры застаўся пры ранейшым саюзе, які заўтра ці пасьлязаўтра могуць ліквідаваць.

Племя маладое, незнаёмае — вярніце бацькаўшчыну, вярніце роднае слова!

## *АБОРТЫ*

За час, што існуе чалавецтва, колькі мільёнаў абортаў зрабілі жанчыны. А гэта ж усё былі б людзі! Яны так і ня ўбачылі неба і сонца, сьнегу і дажджу, травы і лістоты на дрэвах.

Некаторым з іх, можа, і пашанцавала, бо жыцьцё іх аказалася б Вялікаю мукаю, а некаторых шкада. Магчыма, там былі таленты, геніі?

## *МАГІЛА*

Бабка аблюбавала сабе месца на могілках, а тут прыйшлі нейкія людзі і пахавалі на тым месцы іншага чалавека.

Бабка (восемдзесят два гады) раскапала магілу. Труну выцягнуць не змагла, але заявіла:

— Гэта маё месца, я тут лягу, а засыплеце магілу — зноў раскапаю.

Давялося людзям пераносіць труну ў другое месца.

## *САРДЭЧНЫ ПРЫСТУП*

Беларускі паэт Генадзь Бураўкін, выступаючы ў абарону Саюзу пісьменьнікаў у Міністэрстве юстыцыі, схапіўся за сэрца. Яно на нейкі міг спынілася — сардэчны прыступ. Выклікалі хуткую дапамогу, завезьлі ў бальніцу.

Відаць, блізка да сэрца прыняў паэт усё беззаконьне, што творыцца ў краіне.

А іншыя толькі пасмейваюцца.

## *ЯЙКІ*

Несла бабка яйкі ў кошыку на базар, і раптам кошык выскачыў з рук, і яйкі пабіліся. Каб не прападала дабро, бабка пачала піць разьбітыя яйкі. Піла, піла, але ўсе выпіць не змагла. З таго часу на сырыя яйкі бабка і глядзець ня можа.

Нездарма людзі прыдумалі павучаньне: нельга ўсе яйкі класьці ў адзін кошык...

Але гэта ўжо з філасофскім адценьнем.

## *«РЭСПУБЛІКА»*

8 ліпеня 2006 году дзяржаўная газета Беларусі “Рэспубліка” сваю пер-

шую старонку прысьвяціла расейскай прымадоне Але Пугачовай і яе выступленьню ў Віцебску на «Славянскім базары». Адзначана, што прэзідэнт краіны паднёс прымадоне вялікі кошык ружаў.

А на дзявятай старонцы газеты, у куточку, зьмешчаная маленькая інфармацыя. Пра тое, што 2 ліпеня ў Шчучынскім раёне адзначалася сто трыццаць гадоў з дня нараджэньня цёткі — знакамітай беларускай паэтэсы і грамадскай дзеячкі. Ды і той інфармацыі не было б, каб не журналіст Мікола Кароль, які езьдзіў на гэтае сьвята. Кветак на магілу паэтэсы прэзідэнт, вядома, не прынёс.

### *КАЛЕКА*

Мая бабка Магдалена гаварыла свайму сыну:

— Саша, Саша, гультай — найгоршы калека...

### *НЯМА...*

Як цяжка жыць.
Калі няма каго любіць,
Калі няма каго чакаць,
Калі няма каго абняць...

### *ПАХАВАНьНЕ*

27 ліпеня 2006 году хавалі Янку Брыля. Я ня ведала яго хатняга адрасу, ішла па тым накірунку, які паказвалі мне людзі. Каля высокага дому мяне запыніла жанчына:

— Вы не знаете, почему туда идут и идут люди с цветами?

Я таксама ішла з кветкамі.

І я зразумела — гэта ідуць да Янкі Брыля, ён яшчэ тут, на гэтай зямлі.

Пакой, у якім ляжаў Янка Брыль, быў увесь у кветках, шмат вянкоў, а людзі ішлі і ішлі, несьлі і несьлі кветкі.

Труну вынесьлі на вуліцу, і над ёю залуналі бел-чырвона-белыя сьцягі. Хавалі на могілках у Калодзішчах, гэта кіламетраў за дваццаць ад Менску. Пустынная мясцовасьць, тут спачылі простыя людзі. Тут пахаваная жонка Івана Антонавіча і ён наказаў пахаваць яго побач.

І каторы раз апаноўвала мяне крыўда, што вось, чалавека, які зусім нядаўна быў побач з намі, засыплюць зямлёю і ён будзе доўга там ляжаць, хораша прыбраны, абцалаваны, але больш ніколі да нас ня вернецца...

Цяпер і пахаваньне — палітыка. А Беларусь без Брыля асірацела.

### *МАЛАДОСьЦЬ*

Некалі ў вёсцы жанчыны ў пяцьдзясят, шэсьцьдзясят гадоў лічыліся старымі, бабулькамі. І выглядалі яны, у хустачках пад бараду, старэнькімі.

Нядаўна была на адной імпрэзе, там гарадскія кабеты ў пяцьдзясят, шэсьцьдзясят гадоў выглядалі маладзіцамі.

### *ТАЯМНІЦА*

Чаму мёртвы чалавек, нават самы блізкі, выклікае ў нас страх? Можа, таму, што ён перайшоў ужо тую мяжу, якую нам яшчэ наканавана пе-

райсьці, і мы ня ведаем, што нас там чакае? Можа, таму, што ён дакрануўся ўжо да вечнасьці, якая для нас — таямніца? Можа, мы апранаем яго як на сьвята, прыбіраем кветкамі, каб ён ня быў нам Такі страшны? Каб быў падобны да таго, якім мы ведалі яго жывога?

Таямніца, таямніца...

### *БЕСЬСМЯРОТНЫ*

У выдавецтве «Беларусь», дзе я ў свой час працавала рэдактарам, трапіў мне на рэдагаваньне раман Янкі Брыля «Птушкі і гнёзды». Тагачасны загадчык рэдакцыі, якога паставілі замест Міколы Татура, напісаў на раман Брыля заключэньне на васемнаццаці старонках. У чым ён толькі не абвінавачваў аўтара, ледзьве ня ў тым, што Брыль спагадае фашыстам.

І трэба было змагацца за раман, пераконваць начальства, што заключэньне загадчыка няпраўдзівае.

Раман выйшаў у сьвет, і цяпер у мяне на паліцы стаіць экзэмпляр з аўтографам Брыля:

«Лідзіі Арабей, майму мужнаму рэдактару, якой давялося ад гэтай кнігі... З сяброўскай удзячнасцю. Янка Брыль. 10. 01. 65»

Успомнілася мне гэта ў дзень пахаваньня бесьсьмяротнага Янкі.

### *ГЛЫБОКІ СЬЛЕД*

Ці магла падумаць цётка, Алаіза Пашкевіч, што нейкая жанчына, якая народзіцца праз шмат гадоў пасьля яе сьмерці, так блізка прыме да сэрца яе лёс, яе працу, яе адданасьць роднаму краю, што ўсё жыцьцё будзе хадзіць па яе сьлядах, па крупіцах зьбіраць факты яе біяграфіі і пісаць пра яе кнігу? Ці магла падумаць Цётка?

### *ДАКУМЕНТ*

Бывае, мы робім здымак пад настрой, каб зафіксаваць пэўны момант жыцьця, не надаючы таму фатаграфаваньню вялікага значэньня, хутчэй за ўсё, каб паглядзець на сябе, на кампанію, што побач, так сказаць, збоку.

А потым, праз шмат гадоў, гэты здымак робіцца дакументам.

### *КІНО*

Чым кепская адзінота? — Тым, што ты ўвесь час застаешся сам-насам і ў галаве круціцца, пракручваецца шматсерыйны фільм уласнага жыцьця. Ты яго бачыў ужо сотні разоў, ён табе ўжо надакучыў, а тое кіно ніяк не сыходзіць з экрана тваёй памяці і ясна бачыш няўдалыя серыі, але перарабіць іх ужо немагчыма.

### *ЖМЕНЬКА*

Пасьля крэмацыі ад мяне застанецца жменька попелу, і цікава было б самой паглядзець — што ад мяне засталося. Ды, мусіць, ня ўдасца.

### *ЛЁСЫ ЧАЛАВЕЧЫЯ*

Малодшая сястра Цёткі — Алаізы Пашкевіч — у час першай сусьвет-

най вайны выйшла замуж за немца Ота Гампеля. У іх нарадзіўся сын Стэфан.

Муж забраў Зосю з сынам у Нямеччыну, але там, з прыходам да ўлады фашыстаў, да неарыйкі Зосі пачалі ставіцца вельмі непрыхільна, і яна была вымушаная вярнуцца на радзіму. Сын застаўся з бацькам, у Нямеччыне, і выхоўваўся ў адпаведнасьці з фашысцкімі законамі. Калі пачалася другая сусьветная вайна, Стэфан Гампель, сын Зосі, прыйшоў у Савецкі Саюз разам з гітлераўскім войскам.

Але ён убачыў, зразумеў, што тут яго радзіма і адмовіўся ваяваць на баку фашыстаў.

Па сьведчаньні сястры Цёткі Караліны, ён уцёк з войска і хаваўся ў Вільні. Па іншых зьвестках, яго арыштавалі немцы.

Пасьля вайны ён апынуўся ў Амерыцы і прыязджаў у Польшчу, сустракаўся з Каралінаю.

Зося Гампель таксама нейкім чынам дабралася да Амерыкі і памерла там у 1957 годзе.

### *ГЕНІІ*

Праглядала альбом з рэпрадукцыямі Рэмбрандта.

Атрымала тую ж асалоду, як ад чытаньня Пушкіна.

### *КІТАЙ*

Сёньня нашых першакласьнікаў ашчасьлівілі — увялі ў курс іхняга навучаньня кітайскую мову і выдалі ўсім падручнікі па кітайскай грамаце.

Некалі нашая славутая Цётка пісала: “Добра ведаць замежную мову, але найперш трэба ведаць сваю, родную”.

А ў нас з нашаю роднаю моваю катастрофа.

І яшчэ: калі ўжо вывучаць кітайскую мову, то ня грэх ведаць і кітайскую гісторыю. А там у старажытныя часы, калі бачылі, што краіне пагражае перанаселенасьць, дзяўчынак пры нараджэньні проста забівалі. На дзесяць хлопчыкаў пакідалі якіх дзьве дзяўчынкі.

### *ВЕРНАСьЦЬ*

«Но я другому отдана и буду век ему верна», — такімі словамі адказвае пушкінская Тацяна закаханаму Анегіну.

Гераіня аповесьці «Дуброўскі» адказвае чалавеку, якога кахае, што чакала яго да апошняй хвіліны, але цяпер яна абвенчаная і мусіць быць вернай мужу.

Ці не даваў Пушкін гэтымі сюжэтамі ўрокі вернасьці сваёй Наталі?

### *БАЦЬКА І СЫН*

Бацьку рэпрэсавалі як ворага народа. Засталася маладая жонка і маленькі сын.

Жонка хутка выйшла замуж і выхоўвала сына ў любові да айчыма і асуджала бацьку — ворага народу.

Рэабілітаваны бацька вярнуўся з ссылкі праз дваццаць гадоў. Прыйшоў да сына, але хлопец ад яго адвярнуўся, ён быў таму чужы чалавек. І як ні стараўся бацька вярнуць сына, той роднага бацьку так і не прызнаў.

Незагойная рана для чалавека на ўсё жыцьцё.

### *БІТВА*

Шпіталь для ветэранаў і ўдзельнікаў Айчыннай вайны. Людзі вельмі старыя, хворыя і кволыя. Сярод іх і сьляпыя, і глухія, і кульгавыя. То ляжаць на сваіх ложках, то соваюцца па бальнічных калідорах.

Але вось надыходзіць вечар, уключаецца ў зальчыку тэлевізар, і хворыя ажываюць, узгараюцца спрэчкі. Адны хочуць глядзець «Поле чудес», другія — навіны. Гучаць абразьлівыя словы, у ход ідуць мыліцы.

Пачынаецца новая вайна.

### *БУДУЧЫНЯ*

Мы звычайна спадзяемся, мы чакаем, што там, наперадзе, праз нейкі час, будзе ў нас усё добра.

Але прыходзіць тое «наперадзе» і мы бачым, што стала яшчэ горш.

І тады нам здаецца, што тое, мінулае, было лепшае...

### *злыя сілы*

Ёсьць у прыродзе сілы, якія вельмі любяць гуляць чалавечымі лёсамі. Дадуць якому каханьне, дастатак, посьпехі ў рабоце і раптам усё адбяруць, кінуць у такую бездань, адкуль ніколі ужо ня выберашся.

Альбо наадварот — нудзіцца чалавек усё жыцьцё, няма шчасьця, няма долі і раптам тыя сілы падкінуць удачу. Але няхай ня цешыцца, тая ўдача не надоўга, сплыве, як і прыплыла.

Гуляюць тыя сілы амаль з кожным чалавекам, бывае, што не заўважаць каторага і той спакойна пройдзе праз жыцьцё. Але тое вельмі рэдка.

А некаторых, якія нарадзіліся ў тых сілаў не пад настрой, гнятуць з калыскі да магілы.

І ніхто ня ведае, як задобрыць тыя сілы, гэта не начальства, хабарам не адкупішся.

### *МЫЦьЦЁ*

Вельмі люблю дарагое туалетнае мыла, дарагія шампуні, парашкі для мыцьця бялізны, тое, чаго нам не хапала ў маладосьці, у пасьляваенныя гады, калі кавалак гаспадарчага мыла здаваўся шчасьцем. Памятаю, як у вёсках гаспадыні выграбалі з печы попел, прапускалі праз яго гарачую ваду, яна рабілася ад гэтага мяккая і называласяа луг. У ёй жанчыны мылі галаву.

### *АБАЛДЗЕННЫЯ*

Прыдумалі гандляркі на Камароўцы слоўца, як хваліць свой тавар. Падыйдзеш да адной:

— Купляйце кілбаску — абалдзенная! Падыйдзеш да другой:

— Купляйце мяска — абалдзеннае!

Яно і праўда, бывае, што і кілбаска, і мяска абалдзенныя. Але ж і цэны — абалдзенныя!

## *КУРОРТ*

Летам, у час адпачынку — Ялта, Кактэбель альбо Піцунда... Цёплае празрыстае мора і так хораша адплыць далёка ад берагу, а потым вярнуцца стомленаю і легчы на гарачую гальку.

Сталоўка, дзе на белым абрусе цябе чакае смачнае сьняданьне альбо абед.

Вечаровыя прагулкі: глядзім, як патанае ў моры чырвоны дыск сонца, запальваючы аблокі, што спыніліся ля гарызонту.

Здаецца, жыві тут і радуйся.

Але мінае два тыдні, тры і цягне ўжо дадому. А дома што? Розныя клопаты, кухня, якую ненавіджу ўсё жыцьцё. Аднак лічу ўжо дні, хачу ўжо пад сваё неба.

І разумею — ніколі не змагла б я жыць у эміграцыі. Хоць часам і балюча раніць мяне радзіма, але толькі тут маё месца.

## *МАМІН*

Рыгора Бярозкіна ў свой час рэпрэсавалі і выслалі ў Сібір.

Адтуль ён пасылаў лісты сваёй маці і падпісваўся: Мамін Сібірак. Відаць, і там не губляў гумару.

## *ЗНОЎ ТАЯМНІЦА*

Некалі, у школе, у якім сёмым-восьмым класе, мне здавалася, што я ведаю ўсё — і як утварылася зямля, і як зьявіўся чалавек («произошёл от обезьяны»), ведаю ўсё пра космас.

А цяпер, на схіле гадоў, прайшоўшы навукі, начытаўшыся кніг, я зразумела, што ня ведаю нічога, што вакол мяне таямніца і ня ведаюць нічога самыя вялікія вучоныя і самыя разумныя людзі.

Адна ж з найвялікшых таямніцаў — сам чалавек, бо ён сам пра сябе ня ведае нічога.